ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
16
ЧЭРВЕНЯ
№ 21 (1579)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Набліжаюцца канікулы — такі жаданы і доўгачаканы для студэнтаў час. Нарэшце можна закінуць далей падручнікі і канспекты, не сядзець днямі ў бібліятэцы, расслабіцца, адпачыць, пазагараць. І тут перад кожным паўстае пытанне: «Як правесці лета?» Адны плануюць «махнуць» з сябрамі на пабярэжжа Чорнага мора, другія аддаюць перавагу турызму, трэція з большым захапленнем паблукаюць па лесе, наведаўшыся ў вёску да бацькоў, чацвёртыя... Кожны выбірае тое, што яму па густу. Пры гэтым, безумоўна, важна ўлічваць стан здароўя, асабістыя схільнасці і... фінансавыя рэсурсы.

Вы, напэўна, ужо паспелі пазнаёміцца на стэндзе, які вісіць ля прафсаюзнага камітэта студэнтаў, з тым, што вам прапануюць. Гэта выдатнае лячэнне ў санаторыях, цікавы адпачынак у пансіянатах, захапляючыя падарожжы на турыстычных паяздах і г. д. Прычым усе пуцёўкі льготныя. Так што хутчэй рабіце выбар. І прыемнага вам адпачынку!

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### «ГАЎДЭАМУС»

— гэта назва папулярнага студэнцкага фестывалю, сталы ўзрост якога не перашкаджае заставацца яму заўсёды маладым, прыгожым, бадзёрым. Народны ансамбаль народнага танца «Крыжачок» прыме ўдзел у фестывалі, які адбудзецца ў Вільнюсе з 28 чэрвеня па 3 ліпеня. А ў пачатку ліпеня ў Рыгу на фестываль фальклорных калектываў «Балтыка» рыхтуецца народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш».

І. САЛОНЕНКА.

### ПА ПРАПАНОВЕ

канадскіх студэнтаў, якая ўсім вам, спадзяёмся, спадабаецца, наша газета пачынае рэгулярны абмен матэрыяламі з універсітэцкай газетай г. Калгары.

Год назад журналісты беларускага аддзялення АДН падрыхтавалі серыю матэрыялаў аб жыцці нашага універсітэта. Яны былі апублікаваны ў шэрагу студэнцкіх і маладзёжных выданняў краін Еўропы і Амерыкі. У падрыхтоўцы чарговай падборкі можаце прыняць удзел і вы.

З. МАРАВА.

## МЫ — ЛЮДЗІ ДОБРАЙ ВОЛІ

# «Хваля міру»



МІР. Гэта кароткае, але ёмістае слова на ўсіх мовах Зямлі стала самым папулярным за апошні час. Мір — гэта спадзяванне ўсіх простых людзей на планеце. Сёння ён набывае асаблівы сэнс пасля сустрэч у вярхах кіраўнікоў Савецкага Саюза і Злучаных Штатаў. Пацвярджэнне гэтаму — «Хваля міру», якая пракацілася ад шматпакутнай Хірасімы па ўсіх кантынентах у дні работы 3-й спецсесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Хваля галасоў прыхільнікаў міру прайшла і праз адзінаццаць гадзінных паясоў нашай краіны, і Беларусь у ліку іншых прыгранічных рэспублік у мінулую суботу перадала эстафету далей, на Захад.

Як і ва ўсіх гарадах зямнога шара, у Мінску «Хваля міру» пачалася роўна апоўдні. Антываенны мітынг-канцэрт адбыўся ў скверы імя Я. Купалы. На ім выступілі: старшыня Мінскага гарадскога камітэта абароны міру, акадэмік АН БССР, герой Сацыялістычнай Працы Ф. І. Фёдараў, маці-гераіня, ветэран Вялікай Айчыннай вайны К. І. Бацюкова, пісьменнік У. І. Карызна, а таксама студэнтка юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна Е. Чыгірына.

А. БОЕЎ.






НА ЗДЫМКАХ: з палымянымі словамі да ўдзельнікаў антываеннага мітынгу звяртаецца студэнтка БДУ Е. ЧЫГІРЫНА. У час мітынгу.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

## КОНКУРС

# ХТО САМЫ ПАПУЛЯРНЫ

ТАКІМ ПЫТАННЕМ задаліся рэктарат, таварыства «Веды», камітэт камсамола і кафедра грамадскіх навук БДУ імя У. І. Леніна, праводзячы конкурс на самага папулярнага грамадазнаўцу. У распаўсюджанай па ўсіх факультэтах сярод студэнтаў чацвёртых курсаў анкеце прапанавалася выказаць меркаванне па гэтаму пытанню. Кожны, атрымаўшы анкету, павінен быў назваць з усіх грамадазнаўцаў, з якімі ён сустракаўся за час вучобы ва універсітэце, аднаго, найбольш блізкага да ідэалу, ацаніць яго якасці, выставіўшы ў анкеце адзнакі. Прапанавалася дзевяць разнастайных пунктаў: тут і майстэрства лектара, і гатоўнасць адказваць на пытанні, не ўходзячы ад іх, здольнасць думаць нестандартна, уменне навучыць гэтаму другіх.

Тысячу анкет адказныя за гэту справу сакратары камітэтаў камсамола факультэтаў распаўсюдзілі па універсітэту. Праз пэўны тэрмін іх пачалі вяртаць, сабраўшы ўсяго шэсцьсот. Не на ўсіх факультэтах хапіла жадання і зацікаўленасці папрацаваць з анкетамі. Так, на юрфаку, дзе на чацвёртым курсе вучацца 153 чалавекі, вярнулі толькі 7 (!) анкет. Мехмат, маючы 134 чалавекі, даслаў назад толькі 39. Журфак наогул праігнараваў, не вярнуўшы ніводнай анкеты.

Хоць гэта было і папярэдняе апытанне, але такія адносіны да справы адказных і студэнтаў некаторых факультэтаў не спрыялі справе. І ўсё ж сярод факультэтаў, дзе прагаласавала значная большасць, можна назваць кандыдатаў. На філфаку гэта выкладчыкі А. М. Пашкевіч і Т. І. Адамовіч, на хімфаку — Л. І. Дакука, В. А. Баркан.

У верасні-кастрычніку пасля яшчэ аднаго апытання будуць падведзены канчатковыя вынікі. Плануецца такое анкетаванне рабіць кожны год. А пакуль што пытанне «Хто самы папулярны выкладчык грамадскіх навук?» чакае свайго першага кандыдата.

М. АНДРЭЕЎ.

## САМАКІРАВАННЕ: ПЕСІМІСТЫ І АПТЫМІСТЫ

# «АБЫЯКАВАЯ» СКРЫНКА Ў ПРАСТОРЫ ДЗЕЙНАСЦІ

— Студэнцкае самакіраванне на факультэце? — перапытаў мяне намеснік дэкана гістарычнага факультэта Анатоль Пятровіч Салькоў.— Размаўляць на гэту тэму з вамі не жадаю.

— Прабачце, Анатоль Пятровіч, а вы — прыхільнік студэнцкага самакіравання?

— Я? Так...

Як бачыце, крыху нечакана пачалося маё знаёмства са студэнцкім самакіраваннем на гістфаку. Зразумела, кожны чалавек мае права прыняць удзел у размове ці адмовіцца, як у даным выпадку. Але адмова афіцыйнай асобы — намесніка дэкана — гучыць, быццам пэўная пазіцыя адміністрацыі. У прыёмнай дэкана ад выкладчыцы, якая пажадала... застацца інкогніта, атрымаў такі адказ: «У мяне ёсць уласная думка аб студэнцкім самакіраванні, але гэта думка для мяне. Вам жа я не ўпаўнаважаная адказваць». Красамоўныя словы.

Звяртаюся за дапамогай да саміх студэнтаў. Хто ж, як не яны, зацікаўлены ў правядзенні ў жыццё самакіравання! Але на практыцы зразумелая ісціна, на жаль, аказалася не зусім відавочнай.

На кафедры гісторыі КПСС ад трэцякурснікаў пачуў:

— А яно не патрэбна нам. Хай займаецца такімі справамі першы курс. Мы ж — ве... занятыя, калі вучыцца будзем?

Вучоба — аргумент важкі. Ведаюць гісторыкі, чым зручней прыкрыць уласную абыякавасць.

У палажэнні аб студэнцкім самакіраванні ў БДУ імя У. І. Леніна ёсць такія словы: «Студэнцкі калектыў абавязан канцэнтраваць сваю працу на галоўнай справе — вучобе, ствараць усе ўмовы для авалодання ведамі...» Дык, значыць, правы студэнты? Але чытаем далей: «Студэнцкі калектыў абавязан садзейнічаць ідэйна-маральнаму, грамадзянскаму станаўленню будучых спецыялістаў, фарміраванню ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі...»

Мо таму трэцякурснікі абыякава ставяцца да самакіравання, што не супадае яно з іх жыццёвай пазіцыяй? Нямала чуў раней: гісторыкі асуджаны быць кансерватарамі, бо нічога на веру не бяруць, а прызнаюць адзіны факт. Але ж сам факт: гісторыю стварае не што-небудзь, а людзі — асобы сацыяльна актыўныя. Як жа можна выкладаць гісторыю нашай партыі, якая абапіраецца на творчую актыўнасць мас, і быць незалежным ад гэтай творчасці?

Гісторыя — не сухая навука. І каб яе ведаць дасканала, нельга быць «сухаром-дэкларатарам» кніжных ісцін. Трэба спасцігаць веды не толькі са старонак падручнікаў, але і са спраў, у якіх прымаеш удзел.

Самакіраванне — гэта справа. А ці стала яна такой? Якое ж яно ўсё-такі на гістфаку? Звяртаюся за адказам да актыву факультэта.

Сяргей Літвінчук, сакратар камітэта камсамола:

— Працуе стыпендыяльная камісія, у якую ўваходзяць студэнты з розных груп і курсаў.

— А не пагражае гэта неаб'ектыўнасцю ў ацэнцы, нездаровай барацьбой за «сваіх» і супраць «чужых», выкладчык жа быў «нейтральны»?

— Так, выкладчык быў абыякавы, хто пасля яго адзнакі атрымае грошы, а студэнт зацікаўлены. Атмасфера ў камісіі пануе дзелавая, бо выбіраюць сюды людзей неабыякавых, прынцыповых.

Ірына Варабей, член акадэмкамісіі, першакурсніца аддзялення гісторыі СССР:

— Мы праводзім анкетаванне выкладчыкаў, вынікі якога потым абагульняюцца і зачытваюцца на вучоным савеце.

С. Літвінчук:

— Але ж галоўным дасягненнем лічу ўвядзенне ў расклад заняткаў дня самападрыхтоўкі. У БДУ мы першыя, хто адважыўся на гэта. Дэканат хваляваўся, каб вучоба не пайшла ўніз, але аналіз паспяховасці пераканаў і скептыкаў.

— А не спрабавалі вы ўвесці свабоднае наведванне лекцый, як гэта існуе ў некаторых ВНУ краіны?

С. Літвінчук:

— Свабоднае наведванне — расслабіць слабых, а так яны будуць хадзіць на лекцыі — штонебудзь ў галаве і застанецца.

Генадзь Кавалеўскі, намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце:

— Мы дамагліся павелічэння ліміту пропускаў, якія дазваляюцца: з шасці да дваццаці ў семестр. А фактычна вольнае наведванне існуе.

— Якім чынам?

С. Літвінчук:

— Для добрых студэнтаў. Па закону стыпендыю атрымлівае кожны, хто вучыцца на «4» і «5». Так што калі паспяваеш, ніхто ганьбаваць цябе за пропускі не будзе.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## КЛОПАТЫ БІБЛІЯТЭКІ

Задача работнікаў бібліятэкі сёння — прывіць будучаму спецыялісту навыкі інфармацыйнага мыслення, культуру навуковай працы для таго, каб кожны студэнт мог лёгка арыентавацца ў патоку інфармацыі і самастойна, творча працаваць з кнігай.

# Працаваць разам

У СУВЯЗІ з гэтым калектыў бібліятэкі па-новаму арганізаваў вытворчую вучобу сваіх супрацоўнікаў. Яна стала больш інфарматыўнай, накіраванай на тое, каб бібліятэкар умеў прапанаваць студэнту карысную, цікавую кнігу ў дапамогу самастойнай рабоце. Вядучае месца ў арганізацыі гэтай работы займаюць чытальныя залы. У іх прадстаўлены першакрыніцы класікаў марксізму-ленінізму, даведачная літаратура, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Пажадана, каб тут больш было літаратуры для напісання семінарскіх, курсавых і дыпломных работ. І ў гэтым могуць дапамагчы выкладчыкі, якія лепш ведаюць, што выбраць з амаль двухмільённага фонду для паліц адкрытага доступу ў чытальных залах.

Нам хацелася б больш поўна забяспечыць студэнтаў камплектамі падручнікаў. Для гэтага выкладчыкі кафедраў павінны адказна падыходзіць да заказаў літаратуры па тэматычных планах выдавецтваў. Макет камплекта падручнікаў добра было б зацвярджаць на пасяджэннях кафедры. Гэта дазволіць рэкамендацыі выкладчыкаў зрабіць больш рэальнымі, а работу бібліятэкараў — мэтанакіраванай. Не раз мы абмяркоўвалі і пытанне аб тым, што прафсаюзнаму камітэту неабходна ўвесці паказчык чытацкай запазычанасці ў спаборніцтва паміж студэнцкімі групамі.

У вучэбнага абанемента шмат цяжкасцей з забеспячэннем студэнтаў падручнікамі па грамадскіх дысцыплінах. Нам патрэбны рэкамендацыі выкладчыкаў па ўкампелктаванню чытальных залаў. Наогул хацелася б працаваць з выкладчыкамі ў больш цесным кантакце. Гэта забяспечыла б і больш эфектыўную работу бібліятэкі.

**Л. КАВАЛЬЧУК,**
загадчык сектара аддзела абслугоўвання вучэбнай літаратурай.

## ДАЗВОЛЬЦЕ ПРАДСТАВІЦЬ!

# Ва ўдзячнай памяці нашчадкаў

АДДЗЕЛ рэдкай кнігі бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна атрымаў каштоўны падарунак — пяць асобных адбіткаў літаратуразнаўчых работ акадэміка АН БССР, члена-карэспандэнта АН БССР Івана Іванавіча Замоціна, выдадзеных пры жыцці аўтара. Гэта выданні: «Мастацкая творчасць Л. М. Талстога» (1928), «М. Багдановіч. Крытычна-біяграфічны нарыс» (1929), «Сорак год служэння пралетарскаму мастацтву. Да 40-годдзя літаратурнай дзейнасці М. Горкага» (1932), «Творчы шлях А. С. Серафімовіча» (1933), «Паэт пралетарскай рэвалюцыі. Да пяцідзесяцігоддзя Д. Беднага» (1933).

Кнігі у дар выкладчыкам і студэнтам філалагічнага факультэта перадала былая вучаніца акадэміка, настаўніца-пенсіянерка з г. Краснаполле Я. П. Каплунова. Вось што піша яна ў сваім пісьме:

«Пасылаю вам кнігі былога настаўніка — акадэміка І. І. Замоціна. Пры гэтым не магу не выказаць тое, што пакінуў ён у сэрцах сваіх вучняў. Прайшло больш 50 гадоў, як мы, студэнты Мінскага педагагічнага інстытута, затаіўшы дыханне, слухалі яго лекцыі. 50 гадоў не выкраслілі з памяці вобраз гэтага выдатнага вучонага. І калі ёсць настаўнікі «на ўсё жыццё», то такім Настаўнікам быў для нас акадэмік І. І. Замоцін. І калі ў сценах навучальных устаноў ёсць свае багі, то такім богам быў для кожнага з нас Іван Іванавіч: мы любілі яго, мы пакланяліся яму. Самае галоўнае, чым ён нас здзіўляў,— гэта лектарскае майстэрства. У тлумачэнні літаратурных твораў гэта быў сапраўдны лектар-творца, які ўзнаўляў жывую эпоху, жывыя вобразы і характары. Усё, аб чым гаварыў І. І. Замоцін, засталося ў памяці на ўсё жыццё.

Шкада, што гэты выдатны вучоны, таленавіты лектар і абаяльны чалавек пайшоў вельмі рана з жыцця, пайшоў дачасна і бязвінным».

І. І. Замоцін — вядомы рускі і беларускі літаратуразнаўца. Атрымаўшы вышэйшую адукацыю ў Пецярбургскім гісторыка-філалагічным інстытуце ў 1897 годзе, ён ужо ў 1904 абараняе дысертацыю на ступень магістра рускай літаратуры. У гэты ж час ён распачаў педагагічна-выкладчыцкую дзейнасць у Варшаўскім і Пецярбургскім універсітэтах. З 1908 г. І. І. Замоцін — доктар рускай славеснасці і прафесар Варшаўскага універсітэта.

У 1922 годзе быў запрошаны прафесарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта і па 1928 год выкладаў рускую літаратуру на рабфаку БДУ. І. І. Замоцін быў адным з арганізатараў Інбелкульта (1922) і Акадэміі навук БССР. Ён актыўна ўключыўся ў даследаванне гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры, выступаў у друку з крытычнымі матэрыяламі. Акадэмік І. І. Замоцін, як адзначае У. Конан, імкнуўся пераадолець ідэалістычныя і вульгарна-сацыялагічныя тэндэнцыі ў літаратуразнаўстве 20—30-х гадоў, спалучыць лепшыя традыцыі дарэвалюцыйнай айчыннай навукі з марксісцкай эстэтыкай і сацыялогіяй мастацтва. Работы І. І. Замоціна паклалі пачатак сістэматызаванаму вывучэнню творчасці асобных беларускіх пісьменнікаў (Я. Коласа, Я. Купалы, Ц. Гартнага, К. Крапівы, П. Глебкі і інш.), садзейнічалі станаўленню беларускай тэксталогіі. Вядомы ён і як аўтар работ па методыцы выкладання мовы і літаратуры. Пяру акадэміка І. І. Замоціна належыць больш 140 навуковых прац па гісторыі рускай і беларускай літаратуры.

З перададзеных у бібліятэку работ асаблівую цікавасць уяўляе брашура «М. Багдановіч. Крытычна-біяграфічны нарыс». Гэта асобны адбітак уступнага артыкула (усяго 90 старонак) да акадэмічнага выдання твораў Максіма Багдановіча, які ажыццяўляўся ў 20-я гады да дзесяцігоддзя з дня смерці паэта.

Грунтуючыся на шматлікіх успамінах родных, найперш яго бацькі Адама Юр'евіча Багдановіча, а таксама, лістах, запісах і ўспамінах сяброў і паплечнікаў Максіма Багдановіча, аўтар вельмі падрабязна і ўсебакова прасочвае жыццёвы і творчы шлях беларускага паэта. Па-за ўвагай І. І. Замоціна не застаўся ніводзін больш-менш значны факт з жыццяпісу М. Багдановіча. Ім вылучаюцца такія біяграфічныя моманты, як сацыяльная і псіхафізіялагічная спадчыннасць, характар разумовых інтарэсаў пісьменніка, літаратурныя сувязі і літаратурныя ўплывы, інтымныя перажыванні і інш. Звяртае ўвагу І. І. Замоцін і на псіхалагічны стан маладога пісьменніка, які, нягледзячы на цяжкую хваробу, перамагае песімістычны настрой, што часам у яго бываў. Ён перамагае яго «бадзёрымі адносінамі да лепшага будучага як сваёй бацькаўшчыны, так і чалавечага жыцця наогул; ён перамагае сваёй безупыннай і таксама бадзёрай працай на літаратурнай ніве, сваім служэннем характву жыцця як аднаму з фактараў культурнага росту чалавецтва».

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
дацэнт кафедры беларускай мовы БДУ імя У. І. Леніна.

## ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

«Беларускі універсітэт» 8 чэрвеня 1988 года змясціў на першай старонцы некалькі матэрыялаў пра работу кафедры кібернетыкі. У тэкстоўцы да фотаздымка чытаем такі сказ: «Адно са значных дасягненняў кафедры — робат-маніпулятар РМ-01, які пабываў на ВДНГ СССР». Каб пазбегнуць няправільнага тлумачэння, неабходна ўдакладніць і пашырыць сэнс сказанага. Робат «РМ-01» быў распрацаваны і зроблены на НВА «Гранат» сумесна з фірмай «NOKIA» (Фінляндыя). Кафедра ж разам з НВА «Гранат» працуе над удасканаленнем новай мадэлі данага робата, якая атрымала рабочую назву «Гранат 2,5 БК». Асобныя тэхнічныя рашэнні гэтай мадэлі дэманстраваліся на ВДНГ БССР.



Пачаўся сезон туманаў.

## АБРАЗОК

МІРАСЛАЎ ШАЙБАК

# ГУЗІКІ

ЗОРКІ над горадам нагадвалі рассыпаныя гузікі. У дворыку, заціснутым паміж абшарпанымі будынкамі і бетонным парканам, пад аголенымі дрэвамі, на лаўцы сядзелі дзве старыя кабеты. Недалёка ад іх забаўлялася ў копцы сухога лісця дзяўчынка. Старыя сядзелі нерухома. Адна з іх была апранута ў зімовае паліто і пуховую хустку, другая — у шэрачорнае штучнае футра і вязаны берэт. Яна час ад часу паглядала на дзяўчынку.

— Нявестка матэрыял мне на спадніцу падарыла, а я пашыць ужо сама не магу. Пяцьдзесят год шыла, а цяпер зусім аслепла — нітку не зацягну,— сказала кабета ў футры.

— Ага,— кіўнула другая кабета.

— Ты ж падумай, паўвека шыла, а цяпер нітку не бачу, зусім састарэла — сорам каму сказаць. Унучку ў садзік выпраўлю, а сама ледзь жывая — па кватэры цяжка хадзіць, так бы і не ўставала раніцай. І есці ўжо не магу, тхне мне нечым ад ежы, толькі і вару дзеля ўнучкі.

— Ці хадзіла ты да начальства наконт кватэры? — спытала старая ў зімовым паліто.

— Давалі мне кватэру, а я не ўзяла — камуналку трохпакаёвую. Два пакоі мне далі, а ў трэцім жанчына — доктарка наша старая жыве. Памятаеш?

— Чаму ж не. А колькі ёй год? Здаецца, нашмат старэйшая за нас,— разважала ў адказ старая ў зімовым паліто.

— Нашмат... Я таксама ледзь пазнала яе... Столькі год не бачыла... Памірае яна, схуднела зусім і не ходзіць. Такая спрытная некалі была, а зараз толькі ляжыць, і я хутка злягу, ногі пухнуць, раніцай не падняцца, каб не ўнучка. А за доктаркай глядзець трэба, бо яна ляжыць, не ўстае. Мне казалі, што тую кватэру многія хацелі атрымаць, бо як памрэ доктарка, дык яе пакой нікому аддаваць не будуць. А я адмовілася. Сама ледзь жывая, а ў такую кватэру не пайду, каб даглядаць хворага чалавека і чакаць, пакуль той пакой вызваліцца. Дый прыглядзець за ёй не магу. Вось зусім есці перастала — усё тхне мне нечым ад ежы. Дасць бог здароўя — пажыву яшчэ, але вось нітку ўжо не зацягну, матэр'ял нявестцы аддала, хай тая ўнучцы пашые ці сабе пакіне. І кватэру не ўзяла, каб не чакаць чужой смерці.



Да старой, што ў футры, падбегла дзяўчынка і ўзяла яе за руку.

— Не расказвай, бабуля, не расказвай, бо я баяцца буду ноччу. Буду баяцца і плакаць,— хуценька загаварыла дзяўчынка.

— Ідзі, унучка, не бойся, не буду расказваць, не бойся. Ідзі гуляй, а я яшчэ пасяджу трошкі...

Дзяўчынка супакоілася, адышла на некалькі крокаў ад старых і пачала разглядаць нізкае неба, яно, ёй здавалася, пачынаецца адразу за галінамі дрэў.

— Дачка ўчора шафу выкінула, мой яшчэ рабіў. У маім пакоі ўсё ягонымі рукамі зроблена і на кухні зэдлікі — мо год трыццаць стаяць,— пачала расказваць старая ў паліто.

— І мне ж твой зэдлікі рабіў — нявестка на дачу завезла,— перабіла яе старая ў футры.

— Ага, дачка сказала, нашто табе шафа — у пакоі і так цесна, не прадыхнуць. Выкінула шафу, а ўсю маю адзежу ў чамадан склала і пад ложак мне засунула, сказала, што ў мяне няшмат адзежы, і шафа толькі пыл збірае. А ложак таксама мой рабіў, а дачка разам з шафай ягоную адзежу выкінула. Я даўно ягоную бялізну прыхавала — сама не ведаю нашто,— дачка ўсю маю і бацькаву адзежу перабрала, маю ў чамадан, а бацькаву выкінула. Я адно паспела гузікі зрэзаць,— старая, што была ў зімовым паліто, дастала з кішэні жменьку гузікаў і паказала суседцы. Яе рука затрэслася, і гузікі рассыпаліся на асфальт. Яна сагнулася і пачала па аднаму іх падымаць, абціраючы аб паліто і складала ў кішэнь.

Яе суседка ў футры ўстала з лаўкі, паклікала дзяўчынку, і яны зайшлі ў пад'езд. Счакаўшы, у другі пад'езд зайшла старая ў зімовым паліто.

На цёмнай латцы асфальту, недалёка ад лаўкі, засталося ляжаць некалькі белых гузікаў.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
16 чэрвеня
Зак. 1627.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.